# ***Гісторыя беларускай літаратуры і крытыкі***

14 лекцыйных гадзін (7)
12 практычных гадзін (6)

# Асноўная літаратура

Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд. *Пад агульн.рэд. М,А. Лазарука – Мн. 1996*

Гісторыя беларускай літаратуры.XIX –пач. XXст. Пад агульн. рэд. М.А.Лазарука- Мн.,1998

Гісторыя беларускай літаратуры XXст.(20-50гг.) Пад агульн. рэд. М.А. Лазарука-Мн.,2000

*Гісторыя беларускай літатаруы XXст. У 4-х тамах –Мн.2001-2003.*

*ВМК (Багарадава Т.Р., Лысова Н.Б.)*

---

Літаратурныя тэксты (асобныя выданні).

# *Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратуры*

*“Правільна  вызначыць рэч – значыць напалову зведаць яе сутнасць” (Г.Фядотаў)*

- XI-сяр. XVIII ст.  - Літаратура даўняга часу (Старажытная беларуская літаратура)
- Сяр. XVIII – XIX ст.– Літаратура Новага часу (Новая беларуская літаратура)
- беларускя літаратура XX – XXI  ст.

1) Літаратурны працэс пачатку XX ст.
2) Савецкая беларуская літаратура 20-я гг. XX – 80-гг. XX ст.
3) Сучасны літаратурны працэс канца XX  - пач.XXI ст. (пазасавецкая літаратура)

Існуюць іншыя падыходы,
кожны перыяд мае адпаведна сваю перыядызацыю, з’ва ўмоўная

# Літаратура даўняга часу (старажытнага перыяду) -XI-XVIIIстст.

Мастацка-эстэтычныя крытэрыі дазваляюць вылучыць тры этапы:

- XII- XV стст.- літаратура эпохі Сярэднявечча (Готыка)
- XVI ст. –літаратура эпохі Адраджэння
- канец XVI – сяр.XVIII ст. – літаратура эпохі Барока

# *Узнікненне літаратуры*

Звязана з утварэннем ва Усходняй Еўропе першых дзяржаўных фарміраванняў, аб'яднаных на аснове суперэтнічнай, моўнай, рэлігійнай супольнасці, сацыльна-палітычнага ладу жыцця ў агульную культурна-гістарычную зону старажытнарускай дзяржавы

*Старажытнаруская літаратура больш даўняя за заходнееўрапейскія (на аснове лаціны) (адсутнічала літаратура на родных мовах (залежалі ад латыні, грэчаская мова не выканала гэтых функцый, стараславянская - функцыі афіцыйнай мовы, гэта спрыяла: 1)адсутнасці «чыстай» стараславянскай мовы, 2) творчасці на мове, блізкай да народнай, 3)ізаляванасці рускай літаратуры, культуры ад еўрапейскай (і часткова – грэчаскай)

*Пачатак літаратуры – са з'яўленнем пісьменства (пісьмо існавала да прыняцця хрысціянства (Гнёзнаўскія курганы пад Смаленскам – надпіс на амфары "ГОРОУХЩА» іншыя гістарычныя крыніцы эпіграфікі і сфрагістыкі)

Дзелавыя запісы абумоўліваліся патрэбамі дыпламатычнымі і гаспадарчымі.

Фальклор – адзіны від славеснага мастацтва, высокаразвіты, багаты па змесце, жанрава разгалінаваны, з распрацаванай сістэмай вобразна-выяўленчых сродкаў. Функцы: рэлігійна-рытуальная (абрадавая), інфармацыйная, выхаваўчая і ЭСТЭТЫЧНАЯ

# Прыняцце хрысціянства і узнікненне літаратуры.

*вызначальная роля*

новы светапогляд, мараль, эстэтыку, віды мастацтва

садзейнічае пашырэнню і паглыбленню палітычных і культурных сувязей з іншымі краінамі Еўропы,

спрыяла ідэалагічнаму ўмацаванню палітычнага аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў,

*з'яўленню літаратурнай мовы (царкоўнаславянскай, літаратурнага варыянта старажытнарускай мовы),*

*з'яўленню мастацтва рукапіснай кнігі: цэнтрам становіцца манастыр (скрыпторый) (Кіеў, Полацк, Тураў, Смаленск, Ноўгарад, Пскоў і інш.)*

***Першыя літаратурныя творы - помнікі царкоўна-рэлігійнага пісьменства грэка-візантыйскага паходжання.***

# *Спецыфіка старажытнай літаратуры*

**Адрозніваецца ад сучаснай**

**Складаная да ўспрыняцця**: усе рэаліі патрабуюць каментарыя, мастацкія вартасці ўспрымаюцца апасродкавана, яна прадстаўляе іншы спосаб адлюстравання жыцця, мае своеасаблівыя эстэтычныя прынцыпы, мастацкую сістэму бачання (гэта можна ўсвядоміць пры веданні эпохі, асобы аўтара, таму гісторыка-культурны каментар будзе пераважаць над літаратуразнаўчым аналізам).

# Спецыфіка старажытнай літаратуры

- **Літаратура паскоранага развіцця**: **адсутнасць** перыяду **антычнасці** (гісторыка-палітычныя абставіны часу)+уплыў на літаратуру і культуру традыцый Візантыі і Балгарыі
- **Пачынаецца з перакладной літаратуры** (грэка-візантыйская па паходжанні) стала адной з крыніц, стымулам для стварэння арыгінальнай, стварае арганічнае цэлае з арыгінальнай літаратурай, хрысціянстіва – светапоглядная аснова
- **Ананімны** (інтэрнацыянальны, гіперіндывідуальны) **характар:** нявыпрацаванасць паняцця аўтарскага і нацыянальнага права на мастацкі твор
- **Сакральныя адносіны да СЛОВА**: шлях літаратуры ад мастацтва слова і ідэі праз мастацтва вобраза да мастацтва фабулы, шматмоўная літаратура
- **Рукапісны характар** (да пачатку XX ст., нягледзячы на з'яўленне кнігадрукавання) – з'ява унікальная , індывідуальная, сумяшчэнне розных відаў мастацтва: каліграфіі, мініяцюры, прыкладнога мастацтва – пераплёту. Па колькасці спісаў мяркуюць аб папулярнасці твораў "масавых" жанраў.

# *Спецыфіка старажытнай літаратуры*

**Пераймальніцкі характар:** на ўсіх узроўнях мастацкага тэксту, у пошуку аналогіі: важна не скласці новы тэкст, а інтэрпрэтаваць яго ў межах традыцыі

**Сакральныя адносіны да СЛОВА: кніга і ёсць Боскі цуд; слова –сродак-сімвал ракрыцця пазнання ісціны;** шлях літаратуры ад мастацтва слова і ідэі праз мастацтва вобраза да мастацтва фабулы, шматмоўная літаратура

# Асноўны змест вызначаўся задачамі літаратуры: набажэнскай і маральна-дыдактычнай

Літаратура АДНОЙ ТЭМЫ – сэнс чалавечага жыцця,

АДНАГО СЮЖЭТУ – сусветная гісторыя, у цэнтры якой постаць Хрыста (Дз.Ліхачоў)

Патрыятычныя тэма звязаная з праслаўленнем магутнасці, велічы дзяржавы ў кантэксце працягу гісторыі, на міжнароднай арэне (у хрысціянскім свеце)

Маральна-дыдактычная - маральнасць чалавека, яго духоўнае ўдасканаленне і выратаванне

РЭЛІГІЙНАЯ (80%) і СВЕЦКАЯ

# Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры старажытнага перыяду

Гісторыя пачынаецца з XII ст., пісьменства хрысціянскага тыпу.

Змест, тэматыка і праблематыка вызначаліся адмысловым соцыумам, арыентаваным на гуманістычныя каштоўнасці.

Апора на народную традыцыю

Паводле канфесійнай прыналежнасці тыпалагічна прадстаўлена праваслаўнай , каталіцкай, пратэстанцкай, уніяцкай літаратурай (сінтэз усходніх і заходніх традыцый)

Полілінгвістычная: царкоўнаславянская, лацінская, польская, старабеларуская – асноўныя мовы прыгожага пісьменства даўняга часу.

Прадстаўлены ўсе роды і віды літаратуры (эпічныя жанры (белетрыстыка), паэзія, драматургія), выкарыстоўваліся ўсе асноўныя віды і тыпы тропаў

# *Арыгінальная рэлігійная літаратура*

У аснове: мясцовыя матэрыялы, аўтары – старажытнарускія пісьменнікі, героі – асобы, якія праславіліся ў падзеях мясцовага жыцця.

Вядучыя жанры: **жыціе, аратарская проза (слова, казань, пропаведзь)**

**Цэнтры стварэння: Кіеў, Полацк, Тураў, Смаленск, Супрасль і г.д.**

# *Арыгінальная агіяграфія (жыційная літаратура)*

З'яўленне звязана з узнікненнем культу мясцовых святых - з імкнення да царкоўнай і палітычнай незалежнасці ад Візантыі, дзеля ўмацавання міжнароднага аўтарытэту старажытнарускай дзяржавы.

Найбольш значныя па паходжанні з беларускіх земляў:

"Жыціе Еўфрасінні Полацкай" (канец XII-XIII ст.)

"Жыціе Кірыла Тураўскага" (рэдакцыя Славяна-рускага пролага, канец XII-XIII ст., створана магчыма ў Растове, асноўная біяграфічная крыніца про жыццё Кірыла Тураўскага)

"Жыціе Аўраамія Смаленскага" (30-40-яяг. XIII ст., новы тып канфлікту – галоўны герой супрацьстаіць фанатычна насторожаным адзінаверцам, магчымы аўтар -манах Яфрэм-вучань Аўраамія, яму прыпісваецца напісанне службы і іконы)

# *Ідэйна-структурныя асаблівасці жыційных тэкстаў*

**Агіяграфія (жыційная літаратура) – складзеная па асаблівых законах біяграфія хрысціянскіх падзвіжнікаў, якія за розныя заслугі перад царквой і верай былі прызнаныя святымі. Жыццё - прыклад для верніка, ствараліся з маральна-дыдактычнай мэтай. Будаваліся адпаведна канону.**

**Жыцціі бытавалі ў спец. зборніках: мінеях, пралогах, пацерыках (Кіева-Пячорскі пацерык)**

**<u>Змест твора</u> - выразна павучальны, мае ілюстрацыйны характар, ў вобразе святога паказваецца не проста станоўчы, а ідэальны хрысціянскі герой, пазбаўлены індывідуальных рыс жывога чалавека, які дзейнічае ў даволі ўмоўных абставінах. Абавязковымі былі эпізоды, у якіх герой добраахвотна адмаўляецца ад багацця і прымае пострыг, пакутуе або ахвяруе дзеля веры, адлюстроўваліся прыжыццёвыя або пасмяротныя цуды святога.**

## ***“Жыціе Еўфрасінні Полацкай» - першы твор, у якім акрэсліваецца і аналізуецца дзейнасць першай (адзінай) беларускай рэлігійнай падзвіжніцы-кніжніцы***

Помнік захаваўся ў больш чым **паўтары сотні спісах XVI – XVIII ст., якія ўкладаюць шэсць рэдакцый з уплывам розных эпох.**

Мог быць створаны: **ў канцы XII – пач. XIII ст. на царкоўнаславянскай мове**

Сярод верагодных аўтараў: **манах Давыд ( суправаджаў Еўфрасінню ў Іерусалім);**

**Манах Міхаіл, “сакратар” асветніцы, пазней – ігумен мужчынскага манастыра**

**Напісана ў адпаведнасці з агіяграфічным канонам.** У жанравых адносінах ўключае: **біяграфічную аповесць, хаджэнне, пахвалу.**

Асноўны сэнс: **пафаснае ўслаўленне падзвіжніцы**

Мэта: **арганічна ўпісаць дзейнасць Еўфрасінні ў кантэкст паўсюднага пашырэння хрысціянства, паставіць Полацк ў шэраг іншых славутых хрысціянізаваных гарадоў.**

***Аўтарскі стыль вызначаецца спалучэннем інфарматыўнай падрабязнасці з эканоміяй моўных сродкаў, стварэннем эмацыйна насычанага аповяду*** *(характэрна для Полацкай школы)*

# *Арыгінальная аратарская проза*

Узнікла пад уплывам грэка-візантыйскай патрыстыкі. Развіваецца **урачыстае і дыдактычнае** красамоўства.

На беларускіх землях праславіліся:

**Клімент Смаляціч** (XIIст) – другі пасля Іларыёна мітрапаліт-русіч, захаваўся 1 твор ў пераробцы манаха Афанасія "Пасланне Фаме прэсвітэру", старэйшы спіс XVI ст. У аснове - палеміка наконт права алегарычна тлумачыць Святое пісанне, у жанравых адносінах падобны да палемічнага паслання.

Кірыла Тураўскі -аўтар, рэдактар, багаслоў, царкоўны дзеяч, вядома больш за **70 твораў**

1110-1113г. нар., свецкае імя невядома, паходжанне -з мясцовай арыстакратыі, нейкі час – настаяцель Свята–Нікольскага манастыра, ініцыятар рэформ манаскага жыцця, у 1147-48 – дзесяцігадовы затвор (стоўпніцтва), перапіска з Андрээм Багалюбскім (палітыка-экзэгетычнага характару). Памёр у канцы. XII ст. (каля 1182г) і пахаваны ў Барысаглебскім манастыры (11 мая – дзень царкоўнага ўшанавання памяці Св.Кірыла)

# *Творчасць Кірыла Тураўскага. Першы пісьменнік еўрапейскага ўзроўню*

Захавалася больш за 70 твораў. Пісаў у розных жанрах: слова, пропаведзь, павучанне, пасланне, прытча, малітва, канон.

Належыць: **больш за 30 малітваў, 3 каноны** (“Малітоўны”, “Пакаяльны”, “Успенне княгіні Вольгі”), **урачыстыя і павучальныя словы-пропаведзі, прытчы** (“Сказанне **пра** чарнарызчы чын”, “Аповесці пра нядбалага цара і яго мудрага райцу”, “Аб чалавечай душы і целе”).

**Арганічны сінтэз інтэлектуальнасці і высокай мастацкасці**

**Прапаведніцтва** – самая даследаваная частка спадчыны. **Словы-пропаведзі (8)**– рэлігійныя пропаведзі, у якіх тлумачыўся сэнс хрысціянскіх святаў, пытанні веры, біблейскія тэксты. Галоўны мастацкі прыём - **алегарычна-сімвалічнае тлумачэнне біблейных рэаліяў**. Вылучаюцца багаццем вобразаў і паэтычнай мовы, глыбокай эмацыянальнасцю. Некаторыя творы ўнутранай сіметрыяй і агульным рытмічным ладам нагадваюць вершы ў прозе

## *Кірыла Тураўскі-першы пісьменнік еўрапейскага ўзроўню*

**Адметнае месца займае “Прыпавесць пра чалавечую душу і цела” накіраваная супраць уладных памкненняў растоўскага епіскапа Феадорца парушыць адзінства Праваслаўнай Царквы. Мае складаную структуру: Вельмі стракатая алегарычная сімволіка – інструмент, прыём для адказу на фундаментальныя праблемы быцця.**

**Творы К.Тураўскага да XIX ст. перапісваліся ад рукі., XIV – XV стст. уваходзяць у зборнікі-анталогіі ўзорнай аратарскай прозы “Таржэсцвеннік”, “Златавуст”**

**Кірыла Тураўскі – заснавальнік беларускай філасофскай, мастацкай і навукова-філалагічнай традыцыі.**

# Асаблівасці станаўлення старабеларускай літаратуры.

Пераход ад ранняга да позняга Сярэднявечча супаў з **пачатковым этапам станаўлення ўласна беларускай літаратуры.**

На станаўленне старабеларускай літаратуры ўплывалі:

**працэс фарміравання народнасці**,

**утварэнне новай дзяржавы** –Вялікага Княства Літоўскага

**фарміраванне старабеларускай мовы** =паралельна са з’яўленнем літаратуры на гэтай мове (да XVI ст. – аформілася як самастойная сістэма)

# Спецыфіка старабеларускай літаратуры пачатковага этапу: працягвае развіццё ў рэчышчы сярэдневечнай традыцыі

Але літаратура цясней звязвалася з рэальным жыццём – цікавасць да аўтарскай сучаснасці, мясцовых падзей, прыватных тэм прадвызначала стыхійную эмацыянальнасць, прыватны погляд на гісторыю.

Больш цесна была звязана з рэальным жыццём, эпохай СВЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА: паколькі не была так строга абмежавана канонам, хутка і актыўна рэагавала на запатрабаванні часу, непасрэдна і канкрэтна адлюстроўвала змены ў дзяржаве і пісьменстве.

На пачатковым этапе яе развіццё – вынік пашырэння жанравых межаў дзелавога пісьма: яго ўдасканаленне і "алітаратурванне".

# *Летапісанне*

**Летапіс:**

жанр старажытнай літаратуры, ў якім у пагадовай форме выкладаліся розныя гістарычныя падзеі ў храналагічным парадку.

**Летапісны звод:**

гістарычна-літаратурная кампіляцыя, у якой змешчаны ўзятыя з розных па часе, месцы, паходжанні і аўтарскай прыналежнасці творы.

# Беларуска-літоўскае летапісанне – апісанне гісторыі Вялікага княства Літоўскага, вызначэнне яе ў межах ўсходнееўрапейскага кантэксту

Спадчыннае -  ад летапісання Кіеўскай Русі. Афармілася ў **XVIст.**

Эвалюцыя:

Агульна-дзяржаўныя летапісы (XIV-XV)

↓

Мясцовыя хронікі, прыватныя летапісы (XVI -XVII)

↓

Гісторыка-мемуарная літаратура (XVII-XVIII)

# Асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў: паступовае алітаратурванне ("белетрызацыя") тэкстаў

- Прэстыжнасць паходжання літоўскіх князёў (зменены сапраўдныя дадзеныя да 1323 г.)
- Стварэнне сюжэтна закончаных урыўкаў
- Напаўненне рамантычна-фантастычнымі элементамі (XVI ст. легенда пра Палемона інш.), легендарнымі аповядамі,
- Акцэнтаванне на гераічным і трагедыйным, ідэальным і павучальным
- Адчувальны разлік на чытача праз увагу да інтрыгі, захапляльныя сюжэты
- Спроба псіхалагізацыі праз матывацыю паводзін герояў на аснове сярэднявечнай маралі, рыцарскага кодэксу, хрысціянскага гуманізму.
- Своеасаблівая дэмакратызацыя героя : "героем" становяцца прадстаўнікі ніжэйшага стану ("Учтивый люд», паўстанне чоных людзей 1440 г. у г. Смаленску), прырода, незвычайныя здарэнні
- Увядзенне аўтарскага "Я", і падкрэсленая зніжэнне статусу аўтара для ўзвелічэння героя або гісторыі

# Вядомыя летапісныя помнікі перыяду Вялікага княства Літоўскага.

“Летапіс Вялікіх князёў Літоўскіх”

“Беларуска-літоўскі летапіс 1146г”

“Пахвала Вялікаму князю Вітаўту”

“Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага”

“Хроніка Быхаўца”

# “Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх”-

Першы летапіс напісаны на старабеларускай мове.

Быў завершаны каля 1430.

Апісанне палітычнай гісторыі Літвы, Беларусі, Украіны XIV – пач.XV, апісанне напружанай барацьбы нашчадкаў князя Гедыміна за ўладу, барацьбы за палітычнае аб’яднанне ўсходнеславянскіх земляў.

Прадстаўляе сабой звязную гістарычную аповесць, якую можна тэматычна падзяліць на некалькі частак (адсутнічае традыцыйная пагадовая форма)

Твор напісаны з новых ідэйна-мастацкіх пазіцый, асноўнай структурнай адзінкай з’яўляецца сюжэт, што “алітаратурвае” запісы, падпарадкоўвае ідэйна-мастацкай задуме, канцэпцыі твора.

# Беларуска-Літоўскі звод 1446г.

Склад: гісторыя Старажытнай Русі IX –XIII ст., Маскоўскага і Літоўска-Беларускага княства XIV –перш. паловы XV ст., "Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх" з аповесцю пра Падолле.

Гісторыя ВКЛ пададзена на шырокім агульнарускім фоне, хаця гісторыя Русі падаецца фрагментарна і сцісла, ВКЛ – пераемніца старажытарускай дзяржавы.

Мае шэраг матэрыялаў мясцовага паходжання: "Пахвала Вялікаму князю Вітаўту", апавяданне пра паўстанне чорных людзей ў Смаленску і аповесць пра грамадзянскую вайну ў ВКЛ (Смаленская хроніка)

# Пахвала Вялікаму князю Вітаўту: сканцэнтраваны ідэйны змест і гістарычная канцэпцыя першага беларуска-літоўскага зводу.

Адзін з найбольш ранніх твораў панегірычнай прозы.

Прадстаўляе сабой узнёслае, урачыстае, markdown рознабаковае падагульненне паўвекавой дзейнасці Вітаўта (мудры кіраўнік, палітычны аўтарытэт на міжнароднай арэне, агульнапрызнаны лідэр і інш.- праз гэта падкрэсліваецца месца і роля Літоўскага княства сярод іншых дзяржаў).

Створаны манументальны вобраз князя як станоўчага эпічнага героя.

# “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”

Створаны ў 20-ягг. XVI ст. у асяроддзі патрыятычна настроеных літоўскіх арыстакратаў.

Выкладаецца легендарная гісторыя Літвы ад міфічнага князя Палемона да запісаў аб падзеях канца XIV -  пачаткуXVI стст.

Твор напісаны ў форме гістарычнай аповесці, у якой сцвярджаецца паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх патрыцыяў.

Захаваўся ў шматлікіх рэдакцыях.

# “Хроніка Быхаўца”: першая сістэматызаваная палітычная гісторыя краін Вялікага княства Літоўскага

***назаваная па імені захавальніка рукапісу*** (**Аляксандра Быхаўца**, першае палеаграфічнае апісанне –зроблена гісторыкам **Т.Нарбутам**. Рукапіс не захаваўся,

Гэта своеасаблівы ***цыкл аб’яднаных адзінствам тэмы вострасюжэтных апавяданняў*** па гісторыі пачатковага станаўлення Вялікага Княства Літоўскага: кароткая гісторыя жыцця і дзейнасці пешага князя Міндоўга і яго сына Войшалка. Знешне ўяўляе сабой цэльную гістарычную аповесць, структурна – летапісны звод.

Складаецца з “Хронікі ВКЛ і Жамойцкага”, частак запазычаных з “Летапісца ВКЛ” і “Беларуска-літоўскага летапісу 1446г”, дапоўненых мясцовымі матэрыяламі, апрацаванымі сюжэтамі з вядомай гісторыі.

Змястоўна: ***легендарная гісторыя Літвы ад Палемона да Гедыміна, гісторыя ВКЛ да сяр. XIVст., арыгінальная частка апісання падзей XV –пач. XVI ст.***

Многія арыгінальныя запісы – пераказ уражанняў аўтара і ўдзельнікаў падзей, сямейныя паданні

Вызначаецца ***свецкім, ваенна-патрыятычным зместам, антыпольскай скіраванасцю з моцнай тэндэнцыяй гераізаваць нацыянальную гісторыю, белетрызаваць апісанне праз закончанасць сюжэтных ліній, зварот да цікавых і займальных эпізодаў.***

Мова – узор свецкага стылю беларускай літаратурнай мовы XVI ст.

Пераходны твор ад дакументальнага пісьменства да гістарычнай белетрыстыкі.

# Эвалюцыя летапісання

- Вынікам далейшай белетрызацыі гістарычнага апавядання ў бок хранографа пад уплывам розных фактараў  прывяло да ўзнікнення ўласна гістарычнай прозы: хранографаў, мясцовых летапісаў (рэгіянальных і гарадскіх), дзённікаў (дыярыўшаў), мемуараў.
- Прамежкавы паміж летапісаннем і мемуарыстыкай характар маюць Баркулабаўская хроніка, Магілёўская хроніка і інш.